*Анатоль Жытко, кандыдат гістарычных навук, дацэнт БДПУ імя Максіма Танка*

# АДНОСІНЫ ЦАРЫЗМУ ДА ДЗЯРЖАЎНАЙ СЛУЖБЫ ДВАРАН БЕЛАРУСІ (1861—1914)

***Матэрыял артыкула можа быць выкарыстаны пры паглыбленым вывучэнні палітыкі царскага ўрада ў краі пасля скасавання прыгону і да пачатку Першай сусветнай вайны (8 клас, тэма 5: «Рэвалюцыйна-дэмакратычны рух»; тэма 6: «Утварэнне беларускай нацыі. Культура Беларусі»; 11 клас, раздзел II: «Беларусь у перыяд барацьбы за нацыянальнае адраджэнне (60-я гг. XIX ст. — 1917 г.)»).***

У беларускай гістарыяграфіі дзяржаўнай службе вышэйшага саслоўя ў Беларусі не ўдзялялася належнай увагі. Разам з тым роля і месца дваранства ў мясцовай сістэме кіравання мелі важнае значэнне. Дваранства краю было неаднародным па нацыянальнай і веравызнальнай прыналежнасці. Абсалютная большасць набілітэту была беларусамі па нацыянальнай прыкмеце. Частку яго складалі таксама рускія і палякі. Нязначная доля служылага дваранства была прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. Разам з тым па веравызнанні дваране Беларусі ў асноўным былі каталікамі і праваслаўнымі. Гэта акалічнасць дала падставы царскаму ўраду адносіць да рускіх усіх праваслаўных, а да палякаў — каталікаў. Апазіцыйнасць большасці дваран-каталікаў да царызму абумовіла і палітыку ўрада да служылых прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя ў краі.

Па расійскім заканадаўстве прывілеям дваран удзялялася вялікая ўвага. У гэтых адносінах асноўныя артыкулы парэформенных «Законов о состояниях» (т. IX), якія вызначалі юрыдычны статус саслоўяў, у раздзеле амаль поўнасцю паўтаралі дарэформенныя юрыдычныя акты аб асабістых правах. У прыватнасці, у «Своде законов» 1876 года выдання адзначалася, што пры ўладкаванні асоб на дзяржаўную службу неабходна мецць на ўвазе: 1. Паходжанне; 2. Узрост; 3. Веды. «Па паходжанні маюць права ўступаць на грамадзянскую службу патомныя дваране і сыны асабістых дваран» [1, с. 1, 3]. Далей пералічваліся прадстаўнікі іншых саслоўяў. Як бачым, на першым месцы стаіць саслоўнае паходжанне і толькі на трэцім — адукацыя. Больш таго, у заканадаўчых актах адзначалася, што губернатары павінны з асаблівай увагай адносіцца да мясцовых членаў вышэйшага саслоўя, якія нават і па-за службай захоўваюць сваё дзяржаўнае значэнне. «Дваранства ёсць першая апора трона, належыць да вышэйшага і большай часткаю адукаванейшага класу жыхароў, які амаль усё сваё жыццё прысвячае дзяржаўнай службе, складае і па-за ёй надзейнейшы інструмент урада» [2, с. 653].

Хаця дваранства займала адно з першых месцаў па ўзроўні адукацыі, аднак з развіццём капіталістычных адносін, з неабходнасцю ўсё большай колькасці адукаваных чыноўнікаў і ў той жа час з імкненнем самадзяржаўя зберагчы нязменнай сацыяльную структуру ўлады перад урадам быў пастаўлены шэраг праблем. Разам з тым само дваранства не імкнулася да грамадзянскай службы. Звычайна грамадзянскія службовыя пасады найбольш багатыя дваране займалі пасля службы ў арміі, дасягнуўшы пры гэ-

тым высокіх чыноў. Сярэднія і ніжэйшыя пасады, асабліва ў мясцовых адміністрацыйных і судовых установах, займалі дваранскія «пралетарыі» ці выхадцы з іншых саслоўяў. Асабліва гэта было характэрна для Беларусі, дзе жыла вялікая колькасць беззямельнай шляхты. Так, па даных Віленскага генерал-губернатара М.Мураўёва, толькі ў Мінскай губерні і беларускіх паветах Віленскай і Гродзенскай губерняў у 1863 годзе ў якасці пісьмаводаў і валасных пісараў служылі 393 двараніны, альбо 58% ад агульнай колькасці пісараў [3, с. 263—264]. Разам з тым урад быў не ў стане запоўніць усе службовыя вакансіі толькі выхадцамі з дваранскага асяроддзя. Яго намаганні павысіць адукацыйны цэнз пры паступленні на службу і зберагчы пры гэтым правы і прывілеі вышэйшага саслоўя не мелі поспеху. Па афіцыйным прызнанні ўлад галоўная прычына няўдач выцякала з таго, што само дваранства не жадала адмаўляцца ад «зручнасці дасягнення чыноў не заслугамі і выдатнымі ведамі, а толькі праз выслугу гадоў па службе» [4]. Таму, каб павысіць узровень прафесійнай падрыхтоўкі чыноўнікаў, самадзяржаўе вымушана было аддаваць перавагу ўзроўню адукацыі, а не саслоўнаму паходжанню. Гэта палітыка знайшла сваё адлюстраванне ў тым, што ўсе ўстановы Міністэрства адукацыі былі аб'яўлены бессаслоўнымі. Нягледзячы на высокую ўдзельную вагу ў складзе вучняў дзяцей дваран і чыноўнікаў, якія карысталіся значнымі перавагамі пры паступленні, працэнт выхадцаў з іншых саслоўяў паступова павялічваўся, асабліва ў гімназіях і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Акрамя гэтага, на падставе яшчэ дарэформеннага Палажэння ад 25 чэрвеня 1834 года ўсе службовыя асобы падраздзяляліся на разрады менавіта ў адпаведнасці з узроўнем адукацыі [5]. Выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў і медалісты гімназій (I разрад) незалежна ад саслоўнага паходжання на дзяржаўнай службе маглі адразу атрымаць пасаду з прысваеннем чыну X—XIV класа. Асобы з сярэдняй (II разрад) і пачатковай (III разрад) адукацыяй маглі быць залічаны толькі ў якасці канцылярскіх служачых з правам атры[illegible] класнага чыну праз пэўны прамежак часу.

У парэформенныя гады ўдзельная вага дваран сярод чыноўнікаў паступова скарачалася. Калі да 1861 года прадстаўнікі вышэйшага саслоўя дамініравалі сярод служачых ва ўсіх установах і ведамствах імперыі, то на 1 студзеня 1897 года з 126174 штатных пасад васьмі міністэрстваў звыш паловы (73003) прыходзілася на асоб недваранскага паходжання [6].

Відавочна, гэта было выклікана тым, што колькасць студэнтаў і гімназістаў з прадстаўнікоў іншых саслоўяў паступова павялічвалася. Так, ужо ў канцы XIX стагоддзя дваране сярод студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў складалі ўсяго 22,8%, а сярод навучэнцаў гімназій і рэальных вучылішчаў — 25,6% [7].

Разам з тым ва ўскраінных рэгіёнах самадзяржаўе вельмі дбайна праводзіла кадравую палітыку. Гэта ў першую чаргу тычылася Беларусі. Кацярына II, якая вызваліла дваран ад абавязковай дзяржаўнай службы, разлічвала, што памеснае дваранства будзе ў стане арганізаваць сістэму мясцовага кіравання. Але разлікі ўрада яшчэ ў дарэформенны час не спраўдзіліся. З аднаго боку, самі мясцовыя дваране звычайна адмяжоўваліся ад службы, з другога — самадзяржаўе пабойвалася канцэнтрацыі мясцовай улады ў руках дваран-католікаў [8, с. 257]. Палітыка самадзяржаўя ў краі насіла супярэчлівы характар і вагалася ў залежнасці ад палітычных абставін. Так, у 1852 годзе па імператарскім указе дваране-памешчыкі краю, якія мелі не менш 100 душ прыгонных і дасягнулі 18 год, павінны былі паступіць на службу ў якасці падпрапаршчыкаў ці юнкераў. Той, хто не вытрымліваў экзаменацыйны іспыт, залічваўся радавым на правах дваран. Дваране, якія паступалі на грамадзянскую службу, павінны былі праходзіць яе за межамі краю [9, с. 242].

Палітыка самадзяржаўя ў адносінах да грамадзянскай службы мясцовага дваранства стала больш жорсткай пасля падаўлення паўстання 1863 года. Яшчэ 24 сакавіка 1863 года Віленскі генерал-губернатар В.Назімаў у сваёй запісцы на імя міністра ўнутраных спраў пісаў, што

ў сувязі з адстаўкай Гродзенскага губернскага прадвадзіцеля дваранства графа Старжынскага, а за ім і міравых пасрэднікаў ёсць падставы лічыць, што «такога роду дэманстрацыі з боку мясцовага дваранства маглі быць дапушчальнымі для ўрада, якому неабходна выкарыстаць гэты выпадак на сваю карысць, каб раз і назаўжды вызваліцца ад польскага дваранскага ўплыву, які прысвоіў сабе права на замяшчэнне ўрадавых пасад членамі свайго саслоўя» [10, с. 336].

Добраахвотная адстаўка міравых пасрэднікаў паскорыла вырашэнне пытання аб поўнай іх замене ва ўсім краі ўрадавымі чыноўнікамі. Новых міравых пасрэднікаў пачалі набіраць са складу сваіх служачых тры міністэрствы: МУС, дзяржаўнай маёмасці і юстыцыі. Звычайна гэтых чыноўнікаў запрашалі з унутраных губерняў Расіі. Яны не валодалі зямельнай уласнасцю ў краі і не мелі сваякоў сярод мясцовых памешчыкаў [11]. У сувязі з тым, што іх абсалютная большасць не мела іншага даходу, акрамя жалавання, ім павялічылі надбаўку да яго на 50% [12]. Урад спадзяваўся не толькі палепшыць іх матэрыяльнае становішча і заахвоціць службай у краі, але і зрабіць іх матэрыяльна незалежнымі ад мясцовых памешчыкаў. Акрамя гэтага, на ўсіх чыноўнікаў, якія накіроўваліся на службу ў заходнія губерні, распаўсюджвалася правіла, па якім яны прыраўноўваліся да служачых аддаленых губерняў імперыі. Тэрмін абавязковай службы на месцы быў скарочаны з трох гадоў да двух [13].

Гэтыя льготы садзейнічалі шырокаму наплыву чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі. Папячыцель Віленскай вучэбнай акругі ў 1864 годзе вымушаны быў прызнаць, што на заклік М.Мураўёва разам з дзесяткамі сумленных і дзелавітых людзей у краі з'явілася і мноства «галодных, якія шукалі крыніцы нажывы, асоб» [14, с. 565].

Спачатку 50% надбаўкі да жалавання выплачваліся ўсім чыноўнікам праваслаўнага веравызнання. Так, у 1864 годзе 592 праваслаўныя чыноўнікі Віленскай губерні атрымалі 285032 руб. жалавання, а 625 чыноўнікаў-католікаў — 140357 руб. [14, с. 560]. Татальная замена чыноўнікаў рымска-каталіцкага веравызнання (у асноўным дваран) на праваслаўных значна павялічыла выдаткі на іх утрыманне. Таму пазней урад паступова рэгламентаваў ільготы для служачых заходніх губерняў. Так, у адпаведнасці з Палажэннем Камітэта Міністраў ад 21 лістапада 1869 года працэнтныя надбаўкі распаўсюджваліся толькі на тых чыноўнікаў, якія атрымлівалі жалаванне з дзяржаўнага казначэйства. Служачыя дваранскіх апек, сіроцкіх судоў, гарадскіх дум, статыстычных камітэтаў і іншых устаноў былі пазбаўлены гэтага права [15]. Так, у сувязі з гэтым заканапалажэннем у 1872 годзе 59 чыноўнікам Гродзенскай казённай палаты было выплачана дадаткова 8723 руб., [16] а дырэктарам, інспектарам і настаўнікам Мінскай губерні — 48327 руб. [17].

Па законе 13 чэрвеня 1886 года аб перавагах службы ў Заходнім краі надбаўкі да жалавання прызначаліся толькі асобам рускага і немясцовага паходжання [18]. У 1902 годзе кантынгент служачых у заходніх губернях, якія прэтэндавалі на працэнтныя надбаўкі, быў яшчэ больш звужаны. У памеры 50% іх маглі атрымліваць толькі асобы рускага паходжання, за выключэннем мясцовых ураджэнцаў, якія займалі класныя пасады ў канцылярыях духоўных кансісторыяў праваслаўнага веравызнання, у канцылярыях губернатараў, у гарадскіх і павятовых паліцэйскіх установах, а таксама настаўнікі прыходскіх вучылішчаў. Другую групу займалі чыноўнікі ад XIV да VIII класа, але надбаўкі для іх складалі толькі 20%. Акрамя гэтага, усім асобам рускага паходжання, якія запрашаліся на службу ў Віленскую, Гродзенскую і Ковенскую губерні, прадстаўляўся бясплатны праезд. Сямейным настаўнікам і выхавацелям, якія накіроўваліся на працу ў Віленскую вучэбную акругу, выдавалася паўгадавое жалаванне, а адзінокім — адна трэцяя яго частка [19].

Такім чынам, урад рабіў усё магчымае, каб матэрыяльна заахвоціць рускіх чыноўнікаў. Большасць з іх не з'яўляліся патомнымі дваранамі. Разам з тым яны нярэдка займалі пасады, якія раней замяшчаліся прадстаўнікамі толькі заможнага зямельнага дваранства.

Царскі ўрад непакоіла праблема правядзення ў жыццё сялянскай рэформы. Падчас паўстання і пасля яго царызм

зрабіў стаўку на сялян праваслаўнага веравызнання, хаця і мог дамовіцца з буйнымі дваранамі-землеўласнікамі рымска-каталіцкага веравызнання. Урад не абмяжаваўся толькі адхіленнем памешчыкаў ад выканання абавязкаў міравых пасрэднікаў. Наступным крокам было змяненне складу праверачных камісій. Па папярэдніх правілах ад 21 лістапада 1862 года яны складаліся са старшыні — чыноўніка ад урада па прызначэнні міністра унутраных спраў, міравога пасрэдніка пэўнага ўчастка, прадстаўніка ад дваран-памешчыкаў, які выбіраўся на дваранскім сходзе, і выбранага на валасным сходзе прадстаўніка ад сялян. У выніку ў праверачных камісіях перавага была на баку памешчыкаў (член ад землеўласнікаў і міравы пасрэднік). Пасля падаўлення паўстання прызначэнне ў праверачныя камісіі членаў ад памешчыкаў было прызнана немэтазгодным. У сваю чаргу ўрад не адважыўся пакідаць у іх складзе і прадстаўнікоў ад сялян. Замест гэтых двух членаў у праверачныя камісіі па рашэнні Заходняга камітэта і Галоўнага камітэта па ўладкаванні сельскага насельніцтва быў уведзены яшчэ адзін прадстаўнік ад урада — чыноўнік ад Міністэрства фінансаў. З гэтага часу камісіі складаліся толькі з урадавых чыноўнікаў, таму што цяпер і міравы пасрэднік прызначаўся ўрадам [20].

Пачатак пераводу чыноўнікаў-католікаў з Беларусі ва ўнутраныя губерні імперыі быў пакладзены падчас паўстання 1863 года. Аднак гэта тычылася ў асноўным службовых асоб, якія кіравалі сялянскай справай.

Па ініцыятыве М.Мураўёва і са згоды Заходняга камітэта [21] было прынята рашэнне поўнасцю ачысціць усе мясцовыя дзяржаўныя ўстановы і школы Беларусі ад католікаў. Гэта палітыка юрыдычна была афармлена законам ад 22 мая 1864 года [22]. Да канца 1865 года гэта рашэнне практычна было выканана [23, с. 13]. Пры гэтым пераводу з краю на службу ва ўнутраныя губерні падлягалі не толькі католікі, але і праваслаўныя чыноўнікі, жанатыя на каталічках. Руская адміністрацыя лічыла «палячак» фанатычнымі прыхільніцамі рымска-каталіцкай царквы і ідэй нацыянальна-вызваленчага руху. Так, у 1870 годзе ў канцылярыі Гродзенскага губернатара ўсе класныя чыноўнікі пачалі сваю службу пасля 1863 года. Нават сярод някласных чыноў не было ніводнага католіка [24]. У ведамстве Віленскай вучэбнай акругі ўсе службовыя асобы праваслаўнага веравызнання былі прызначаны не пазней 1865 года [25, с. 1—6]. У канцылярыі Мінскага губернатара ў 1870 годзе ў штаце налічвалася 9 чал. Усе яны былі праваслаўнымі. З іх трое былі ўзнагароджаны ордэнамі, якія давалі права на дваранства. Толькі ва ўрачэбным аддзяленні губернскага праўлення з 46 чал. 17 былі католікамі і 5 — іудзеямі. На долю праваслаўных і лютэран прыходзілася 24 чал. Што цікава, губернскі статыстычны камітэт узначальваў католік, сусветна вядомы археолаг і краязнаўца граф Яўстах Тышкевіч [26, с. 4, 47]. Магчыма, яго прызначэнне на гэту пасаду было звязана з больш мяккай палітыкай у адносінах да дваран-католікаў з боку новага Віленскага генерал-губернатара Патапава. У гэтым жа годзе ў яго грамадзянскім ведамстве з 298 чыноўнікаў былі 97 католікаў [27]. Праўда, яны займалі нязначныя пасады, у асноўным былі канцылярскімі служачымі. Разам з тым былі і два выключэнні. Так, стацкі саветнік дваранін-католік Ляховіч з'яўляўся памочнікам губернскага ўрачэбнага інспектара. Стацкі саветнік, кавалер ордэнаў Св. Ганны і Св. Станіслава Эйнаровіч быў членам губернскай установы па сялянскіх справах. Відавочна, справа ў тым, што ў свой час яны выступілі супраць паўстанцаў, таму што былі ўдастоены медаля «В память об усмирении польского мятежа 1863—1864 гг.» [28, с. 12, 15].

Хаця адпаведна закону ад 22 мая 1864 года на дзяржаўную службу ў краі забаранялася прымаць католікаў толькі ў якасці начальнікаў установ, але на практыцы гэта тычылася амаль усіх службовых месцаў. Так, 17 кастрычніка 1868 года дырэктар паштовага дэпартамента ў сваім цыркулярным пісьме прапанаваў губернатарам не прымаць католікаў на новыя вакансіі, а тых, хто служыў, — не павышаць па пасадзе. Гэты цыркуляр зноў быў пацверджаны ў 1899 годзе. Такім жа пісьмом ад 27 кастрычніка 1884 года генерал Безак забараніў пры-

мацъ на службу католікаў і ў тэлеграфныя ўстановы [28]. З 1893 года католікам, а таксама афіцэрам, якія былі жанаты на каталічках, забаранялася служыць у ваенных крэпасцях [28].

Пашырэнне адміністрацыйнага апарату прыводзіла да таго, што ў краі, нягледзячы на павышаныя аклады, паступова адчувалася, што не хапае чыноўнікаў рускага паходжання. Таму ўрад вымушаны быў замяшчаць нязначныя пасады мясцовымі служачымі-католікамі. У прыватнасці, па правілах ад 26 чэрвеня 1897 года міністру ўнутраных спраў дазвалялася выйсці з прапанован дапушчаць на пасады па казённым продажы віна католікаў, якія з'яўляліся палітычна благанадзейнымі [29]. З 7 жніўня 1898 года католікам дазвалялася замяшчаць пасады гарадскіх, вясковых і ветэрынарных урачоў, а таксама павітух у Магілёўскай губерні. З 20 чэрвеня 1902 года гэта правіла распаўсюджвалася на Мінскую і Віцебскую губерні, а з 27 лістапада 1903 года — на Віленскую і Гродзенскую [30]. Пры гэтым агаворвалася, што кандыдаты павінны быць адданымі трону і «ва ўсім павінавацца, не шкадуючы жывата свайго, да апошняй кроплі крыві» [31]. У 1903 годзе Віленскі генерал-губернатар Святаполк-Мірскі ў сувязі з намечаным ўвядзеннем у Паўночна-Заходнім краі інстытута земскіх начальнікаў хадайнічаў перад МУС аб прызначэнні на гэтыя пасады 9 са 152 земскіх начальнікаў польскага паходжання. 27 лістапада 1903 года імператар уласнаручна зацвердзіў іх на гэтыя пасады [32].

У сувязі з пачаткам рэвалюцыі ўрад прыняў шэраг мер па лібералізацыі службы католікаў у Заходнім краі. 1 мая 1905 года Мікалай II зацвердзіў журнал Камітэта Міністраў аб парадку замяшчэння службовых пасад у 9 заходніх губернях. Адпаведна яму ўводзіўся пералік пасад, якія не маглі займаць католікі ў краі. Так, па ведамствах Міністэрства юстыцыі гэта тычылася старшынь і намеснікаў судзебных палат, акружных судоў і пракурораў, што працавалі там. Па Міністэрстве народнай адукацыі католікі не маглі быць дырэктарамі, інспектарамі, выкладчыкамі рускай мовы, гісторыі, геаграфіі і педагогікі. Акрамя гэтага, яны пазбаўляліся пасад у пачатковых вучылішчах. Па Міністэрстве фінансаў — кіраўнікамі казённых палат, акцызных акруг, усіх дзяржаўных банкаў. Гэта правіла тычылася начальніцкага складу і Міністэрстваў земляробства, дзяржаўнай маёмасці, шляхоў зносін і дзяржаўнага кантролю. Гэта было значным паслабленнем у параўнанні з правіламі 1864 года. Разам з тым Камітэт Міністраў адзначаў, што «такі пералік пасад нельга разумець як абавязак замяшчаць усе іншыя пасады... асобамі польскага паходжання» [33]. Прынамсі, гэты дакумент не падлягаў апавяшчэнню.

Аб тым, што закон 1 мая 1905 года карэнным чынам не змяніў сітуацыю, сведчаць спісы служачых Віцебскай губерні. Так, у 1909 годзе з 62 чыноўнікаў Віцебскага губернскага праўлення католікамі былі толькі 2 чал., якія з'яўляліся канцылярскімі служачымі без чыну. У Віцебскім гарадскім паліцэйскім праўленні быў толькі адзін католік. У падатковай інспекцыі і казённай палаце ўсе служачыя былі праваслаўнымі. У Віцебскай кантрольнай палаце з 24 чыноўнікаў быў адзін католік, і той працаваў журналістам [34].

Вызначыць дынаміку колькаснага складу дваран сярод дзяржаўных служачых немагчыма. Справа ў тым, што чыноўнікі размяркоўваліся ў адпаведнасці з класам пасады. Самы высокі клас, які даваў правы патомнага двараніна, раўняўся IV. У губернях жа яго звычайна мелі губернатар і губернскі прадвадзіцель дваранства. Нейкае ўяўленне аб прадстаўніцтве вышэйшага саслоўя ў дзяржаўных органах кіравання дае спіс чыноўнікаў Мінскай губерні па ведамстве МУС (канцылярыя губернатара, паліцэйскае праўленне, гарадское грамадзянскае праўленне, дваранскія ўстановы, Мінскае губернскае і павятовыя ўстановы па сялянскіх справах, Мінскі прыказ грамадскага апякунства, аддзел па перавозцы пошты па чыгунцы, Мінская губернская паштова-тэлеграфная акруга, Мінскае губернскае праўленне, урачэбнае і ветэрынарнае аддзяленні). Так, у 1897 годзе тут налічвалася 674 чыноўнікі, з якіх дваранскім тытулам валодалі 122 служачыя, альбо 18,1%. З іх мелі пасады IV класа 2 чал., ад VIII да V — 57, ад XIV да

IX класа — 63 чал. Менш за ўсё налічвалася дваран ў аддзеле перавозак пошты па чыгунках — 12,6%, ва ўрачэбным і ветэрынарным аддзелах — 9%, а ў Мінскай паштова-тэлеграфнай акрузе — толькі 6,7%. Дзесяць пасад з 12 дваране займалі сярод служачых губернскага дваранскага дэпутацкага сходу і 23 (82,1%) з 28 — у Мінскім губернскім і павятовых ўстановах па сялянскіх справах [35].

У сувязі з увядзеннем у 1911 годзе ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях земскага бессаслоўнага самакіравання становішча крыху памянялася. Хаця і пры гэтым урад зрабіў шэраг захадаў, каб не дапусціць дваранства рымска-каталіцкага веравызнання да кіравання краем. Справа ў тым, што ўсе выбаршчыкі падзяляліся па курыях у адпаведнасці з веравызнаннем — на рускую (не каталікі) і польскую (каталікі). Пры гэтым колькасць дэпутатаў ад нацыянальнай курыі ў земства ўстанаўлівалася ў адпаведнасці з сярэднеарыфметычным ад сумы працэнтаў колькасці выбаршчыкаў і вартасці іх нерухомай маёмасці. Напрыклад, калі колькасць выбаршчыкаў у «польскай» курыі пэўнага павета складала 6% ад агульнай, з іх нерухомая маёмасць — 44%, то лік дэпутатаў земства ў дадзеным выпадку не мог перавышаць (6 + 44) : 2 = 25% [36, с. 33]. У сувязі з гэтым, хаця землеўладанне дваран-католікаў у Мінскай губерні некалькі пераважала землеўладанне прадстаўнікоў іншых канфесій, у склад 286 павятовых земскіх галосных трапілі толькі 49 дваран-землеўладальнікаў рымска-каталіцкага веравызнання. У цэлым жа сярод павятовых земскіх галосных было 151 дваран, афіцэраў і класных чыноўнікаў, што складала 52,8% [37]. У выканаўчых жа земскіх органах губерні быў толькі адзін католік [37].

Такім чынам, у парэформенны перыяд урад праводзіў палітыку адлучэння дваран рымска-каталіцкага веравызнання ад дзяржаўнай службы ў Паўночна-Заходнім краі. Вакантныя месцы замяшчаліся выхадцамі з унутраных губерняў Расіі, якія ў асноўным былі разначынцамі, не ведалі мясцовай спецыфікі. У краі іх прываблівалі высокае жалаванне і больш хуткі шлях атрымання павышанага класа пасады, ордэны, а гэта служыла гарантыяй атрымання тытула асабовага ці патомнага дваранiна. Палітыка царскага ўрада прывяла да таго, што сярод прадстаўнікоў адміністрацыйнага апарату краю не склалася нацыянальная служылая інтэлігенцыя як носьбіт нацыянальна-дзяржаўнай ідэі.


1. Свод законов Российской империи. — Т. 3. — Кн. 1. — СПб., 1876.
2. Свод законов Российской империи. — Т. 2. — Ч. 1. — СПб., 1876.
3. Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863—1864 гг. в пределах Северо-Западного края // Виленский временник. — Кн. VI. — Вильна, 1913.
4. ПЗС. I. Т. 30. № 23771.
5. ПЗС. I. Т. 9. Отд. 1. № 7224. § 2.
6. РДГА, Ф. 1200. Воп. 1. Спр. 1. Ч. 2. Арк. 727.
7. РДГА. Ф. 1283. Воп. 1. Спр. 167. Ч. 2. Арк. 66—68.
8. Исторический обзор деятельности Комитета Министров. — Т. 1. — СПб., 1902.
9. Исторический обзор деятельности Комитета Министров. — Т. 2. — Ч. 1. — СПб., 1902.
10. Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863—1864 гг. в пределах Северо-Западного края // Виленский временник. — Кн. VI. — Вильна, 1913.
11. ПЗС. 2-е собр. Т. 38. № 40366, 40427. Т. 39. № 41066.
12. ПЗС. 2-е собр. Т. 39. № 39935.
13. НГАБ Ф. 2512. Воп. 1. Спр. 614. Арк. 4.
14. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. — Т. 2. — Мн., 1940.
15. НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1982. Арк. 1, 2.
16. ДГАБ. Ф. 1. Воп. 7. Спр. 226. Арк. 158—161.
17. НГАБ. Ф. 299. Воп. 7. Спр. 292. Арк. 57—62.
18. РДГА. Ф. 1284. Воп. 190. Спр. 85. Арк. 16.
19. Продолжение Свода законов Российской империи 1902 года. — Т. 3. — Ч. 1. — СПб., 1902. Положение об особых преимуществах гражданской службы в отдельных местностях, а также в губерниях Западных и Царства Польского. Арт. 39—41.

20. ПЗС. 2-е собр. Т. 38. № 39463.
21. РДГА. Ф. 1283. Воп. 1. Спр. 41. Арк. 59.
22. РДГА. Ф. 1276. Воп. 1. Спр. 106. Арк. 71.
23 *Миловидов А.И.* Участие молодежи Северо-Западного края в мятеже 1863 года и вызванная нм реформа местных учебных заведенйй. — Вильна, 1904. — С. 13.
24. ДГАВ. Ф. 1 Воп. 6. Спр. 2303. Арк. 12.
25. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1874 год. — Вильна, 1874.
26. Памятная кннжка Минской губернни на 1870 год. — Мн., 1870.
27. Памятная кннжка Виленской губернин на 1871 год. — Вильна, 1870.
28. РДГА. Ф. 1276. Воп. 1. Спр. 106. Арк. 74.
29. РДГА. Ф. 1283. Воп. 1. Спр. 41. Арк. 60.
30. РДГА. Ф. 1276. Воп. 1. Спр. 106. Арк. 71—72.
31. ДГАБ. Ф. 1. Воп. 8. Спр. 1780. Арк. 8.
32. РДГА. Ф. 1276. Воп. 1. Спр. 106. Арк. 72.
33. НГАБ. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 13147. Арк. 2—3.
34. НГАБ. Ф. 2502. Воп. 1. Спр. 666. Арк. 34—44, 74, 163—172, 219.
35. НГАБ. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 10543. Арк. 95—103.
36. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. // Весці АН БССР: Сер. грамад. навук. — 1972. — № 4.
37. НГАБ. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 23. Арк. 54—58, 50.

*Елена Космач, доцент БГПУ им. Максима Танка*

# ИЛНЯ ГАРАШАННН: СЕРБСКИЙ НАЦНОНАЛЬНЫЙ ЛНДЕР (1843—1867)

## За национальное освобождение (Всемирная история, 11 кл., § 16)

*Цель данной статьи — показать роль И.Гарашанина как наиболее значительного государственного лидера Сербии середины XIX века, сыгравшего огромную роль в определении целей и основных направлений сербской внутренней и внешней политики. Его труд «Начертание» отразил цели освобождения, и объединения всех сербов Османской и Габсбургской монархий, и, в конечном итоге, единства всех южных славян.*

*Материалы исследования рекомендуются для углубленного изучения истории борьбы славянских стран на Балканах.*

Илия Гарашанин представлял собой одну из ключевых фигур сербского национального возрождения, являясь ядром, вокруг которого объединялась патриотически настроенная сербская интеллигенция. Министр внутренних дел Сербии (1843—1852), а также премьер правительства и министр внутренних дел (1852—1853, 1861—1867), Илия Гарашанин был выдающимся государственным деятелем, дипломатом и патриотом, глубоко национальным по своим политическим и социальным взглядам.

Важнейшей задачей его деятельности была подготовка войны за национальное освобождение сербов от турецкого владычества, а также достижеиие их объединения под началом Сербии, как Пьемонта, или их ядра. Он представлял эту войну в своем воображении, которая, к счастью для Сербии, не состоялась при его жизни.

Как министр внутренних дел, Гарашанин организовал сеть агентов в других сербских землях и улучшил отношения с Черногорией. В ходе революции 1848 года он помогал воеводинским сербам и превратил Белград в главный политический центр сербского мира. Во время нахождения на престоле принца